Нельга набыць, не страціўшы

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
03.04.2022 00:00



Кангрэгацыя сясцёр назарэтанак у Беларусі перажыла дзве сусветныя вайны і савецкія атэістычныя часы. Пры гэтым у самы складаны перыяд нашай гісторыі яна нават здолела накіроўваць навіцыюшак з Гродна ў Штаты, каб падсілкоўваць духоўна амерыканскіх вернікаў. У 1990-ыя гады кляштар запоўніла вялікая хваля пакліканняў. І хоць цяпер кангрэгацыя ў Беларусі не такая вялікая, як можна было спадзявацца пасля перамен “адлігі”, яна застаецца самай шматлікай у краіне.

Пра прызнанасць Кангрэгацыі Сясцёр Найсвяцейшай Сям’і з Назарэта на нашых землях, яе буйны росквіт і запавольванне гэтага працэсу размаўляем з Правінцыяльнай сястрой Беларускай правінцыі назарэтанак Філатэяй Ціхановіч CSFN. ***– Сястра Філатэя, адкуль Вы даведаліся пра сясцёр назарэтанак? Ці разглядалі іншыя варыянты жаночых манаскіх супольнасцей, калі планавалі ўступіць у кляштар?***

– Я паходжу з Гродна – горада, дзе сёстры назарэтанкі служылі здаўна, без перапынку ў час ваеннага перыяду.

У 1990-ыя гады, калі мне было 18, я пачала хадзіць у касцёл, стала актыўна ўдзельнічаць у жыцці пабернардынскай парафіі, дзе на той момант манахіні не толькі служылі, але і жылі. Адна з іх рыхтавала мяне да прыняцця Першай св. Камуніі. Таму можна сказаць, што сясцёр я ведала з самага пачатку свайго духоўнага шляху. Аднак вялікую ролю ў станаўленні мяне як духоўнай асобы адыграла кармэлітка – с. Тэрэза ад Дзіцятка Езус. Яе дзённік быў маёй настольнай кнігай. І манаскае жыццё я ўяўляла

менавіта такім, якім яго апісвала с. Тэрэза – закрытым, недаступным для вока іншага чалавека. Адпаведна, калі ў мяне ўзніклі думкі пра кляштар, я хацела далучыцца да супольнасці сясцёр кармэлітак. Але на тэрыторыі Беларусі іх кляштара не было, а ехаць у Польшчу не падавалася добрай ідэяй, бо мову я ведала дрэнна. Таму і ўступіла ў тую супольнасць, якая “была пад рукой”. Я добра камунікавала з сёстрамі назарэтанкамі, а іх настаяцельніца ўвогуле дапамагла мне раскрыць сваё пакліканне і ўпэўніцца ў ім падчас асабістых размоў.

– Наколькі ўвогуле былі вядомыя сёстры назарэтанкі на момант Вашага ўступлення ў кляштар?

– Дастаткова вядомыя.

У 1994 годзе, калі я далучылася да супольнасці сясцёр, яны служылі ў Гродне, Навагрудку, Шчучыне, Лідзе і даязджалі ва ўсе навакольныя вёскі. Ды і дзяўчаты, што прыйшлі ў кляштар раней мяне, паходзілі ў асноўным з Гродзеншчыны. Шмат пакліканняў, якія нарадзіліся ў 1970-1980-ыя гады, – таксама пакліканні нашых зямлячак. Мяркую, гэта можа сведчыць пра тагачасную актуальнасць назарэтанскай місіі.

– Ці ўплываў прыклад 11-ці сясцёр мучаніц з Навагрудка і с. Малгажаты Банась на “папулярнасць” кангрэгацыі ў Беларусі?

– Прыклад с. Стэлы і яе паплечніц – гэта радыкальны прыклад жыцця Евангеллем. І я ўпэўнена, што ён прыцягвае маладыя сэрцы, бо маладзёны патрабуюць, яны шукаюць каштоўнасцей і сведкаў Хрыста. І гэты прыклад даў свой плён ды працягвае яго прыносіць.

Аднак з уласнай гісторыі хачу сказаць, што калі я ішла ў кляштар, мяне прыцягваў выключна Езус, я імкнулася проста развіваць з Ім адносіны. Пра подзвіг 11-ці сясцёр мучаніц я даведалася, будучы ўжо ў супольнасці назарэтанак.

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
03.04.2022 00:00



Нельга набыць, не страціўшы

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
03.04.2022 00:00

